Студ. гр. Дзо-8 Хаткевіч І.М.
Навук. кір. дац. Радзецкая В.Ф.

# АСВЕНЦЫМ І ЛЁС ЧАЛАВЕКА

Гучыць лічба – 65928. Гэта нумар, маркіроўка, штамп, але не на паперы – на скуры чалавека. Нумару 66 гадоў. Так дагэтуль і не змыўся, не знік. Гэта напамін пра тое, як памячалі людзей у адзіным лагеры смерці – Асвенцыме. Так рабілі дзеля таго, каб потым было лягчэй лічыць загінуўшых. Як жывёлу, што кляймяць.

Асвенцым-Бжэнка, ці па-нямецку Аўшвіц-Біркенаў, быў створаны на тэрыторыі акупіраванай Польшчы германскімі вайскамі па загадзе фюрэра прыкладна ў 60 км ад Кракава 27 красавіка 1940 года на аснове артылерыйскай базы.

Зараз там музей. Месца, спецыяльна захаванае ў назіданне нашчадкам. Каб больш такога не паўтарылася. Каб больш не было на зямлі такіх жудасных плямаў. Чорных – ад безнадзейнасці. Чырвоных – ад пралітай крыві. Шэрых – ад попелу спаленых у крэматорыях цел.

Давялося прайсці праз лагеры смерці і маёй бабулі Івановай (Прахарэнка) Галіне Яфімаўне. Іх было чатыры – Пяты полк, Асвенцым, Патуліца і Дэссаў. Здарылася гэта з-за здрадніцтва. У захопнікаў аказаліся спіскі атрада Райцэва, дзе ў партызанах быў мой прадзед.

У маі 1943 г. бабулю з яе трыма малодшымі сёстрамі і маці забралі ў Пяты полк у г. Віцебску. Маёй бабулі было 13 гадоў. У Пятым палку яна правяла 2 месяцы. Па яе ўспамінах, там было вельмі дрэнна, кармілі чым прыйдзецца, здзекаваліся.

У кастрычніку 1943 г. іх вывезлі ў Асвенцым. Везлі ў закрытых вагонах для жывёлы, няспынна. Было цесна. Многія паміралі. Ніхто не ведаў, што будзе далей, і куды іх вязуць. Пра Асвенцым у час вайны мала хто ведаў.

Па прыбыцці ўсіх выгналі з вагонаў, забралі іх рэчы і адзенне. Заганялі ў розныя баракі, дзе абстрыгалі, абдавалі пры мыцці то гарачай, то халоднай вадой. Новае лагернае адзенне кідалі проста на зямлю, не хвалюючыся, што каму дастанецца і ці ўсім хопіць. Але больш за ўсё запомнілася бабулі тое, як рабілі татуіроўкі з нумарамі. На жывую. Дзеці плакалі, страчвалі прытомнасць, а некаторыя і паміралі ад болю і жаху. Бабуліна імя Прахарэнка Галіны Яфімаўны ў Асвенцыме замяніў нумар – 65 928. Сясцёр разлучылі. Бабуля жыла ў бараку № 16. Жыць там было дрэнна і страшна. Побач стаялі крэматорыі. Калі кагосьці палілі, барак зачынялі і выключалі святло, але дзеці ўсё роўна чулі пах смерці, жахлівы і незабыўны.

Потым яе перавезлі ў Патуліцу, дзе яна сустрэлася з сёстрамі. Там некалькі разоў у месяц у дзяцей бралі кроў, хаця згодна з медыцынскімі паказчыкамі гэта не дазвалялася рабіць больш за адзін раз. Кроў накіроўвалі ў нямецкі шпіталь, што быў побач. Бабулі, як старэйшай, даставалася больш за іншых. Многія дзеці не вытрымлівалі. Паміралі ад страты крыві і дрэннай ежы.

Бабуля казала, што часам яны спалі на нарах побач з мёртвымі. Гэта ўсё было ўдарам па дзіцячай псіхіцы.

У маі 1944 г. бабулю перавезлі ў Дэссаў на Эльбе, зноў разлучылі з сёстрамі. Так яна апынулася ў Германіі.

З яе слоў:

"Там мы ад цямна да цямна напільнікамі тачылі запчасткі для самалётаў. Калі не выконвалі план – нас каралі. У Дэссаў было не лепш, чым у Асвенцыме.

Вызвалілі нас амерыканцы 22 красавіка 1945 г. Ішлі баі. У наш барак трапіў і разарваўся снарад. Мы былі ў кроку ад гібелі. Але нам пашчасціла. Выбух не закрануў вугал, дзе мы сядзелі. Амерыканцы, што прынеслі нам вызваленне, кармілі нас, тады яшчэ дзяцей, шакаладам. Відаць, шкадавалі. Ды і выглядалі мы ўсе тады смяротна хворымі.

Ужо Савецкая Армія перапраўляла нас у Беларусь. Спачатку ў дзіцячы дом у Маладзечна. Потым, даведаўшыся, што я там, за мной з вёскі прыехаў бацька".

Вайна і Асвенцым разбурылі шмат сем'яў і лёсаў людзей. Бабулі пашанцавала. Усе яе родныя вярнуліся жывымі. І бацька, і маці, і малодшыя сёстры. Але галоўным было тое, што бабуля не згубіла сэнсу жыцця ў лагерах смерці, а знайшла ў сабе сілы жыць далей.

Яна вывучылася, выйшла замуж, нарадзіла дзяцей. Зараз ёй 79 гадоў. Яна справіла залатое вяселле. У яе 3 унукі і 4 праўнукі.

Асвенцым змяніў лёс і характар многіх людзей. Але не зламіў маю бабулю. Яна засталася добрай, ветлівай, вясёлай, заўсёды гатовай дапамагчы.

Мне хочацца сказаць ёй "дзякуй" за яе нязломлены дух, дабрыню і любоў.

Яна – мой герой,
Хоць зброі ў руках не трымала.
Яна – мой герой,
Бо сілы далей жыць знайшла.
Яна – ідэал.
Такіх, як яна, было там нямала.
Цяпер жа
Яна засталася адна.
У вёсцы…
У краіне іх болей,
Але ж не спыніць час, нічым не стрымаць.
Яны пакідаюць нас
Сведкі страшэннай няволі,
Што ў лагерах смерці знайшлі ў сябе дух выжываць.
Бабуля, я ведаю, сны табе сняцца…
І чуецца мова чужая для нас.
Асвенцым. Дым зноў там гатовы ўзняцца
З тых печаў, што душы няспынна палілі ў той час.
Ты – мой ідэал.

Я люблю цябе шчыра,
Хоць час забірае гады ў нас жацця.
Ты – мой ідэал.
І твае запаветы аб міры
Я памятаць буду, бо помню, праз што ты прайшла.

Студ. гр. Кд-14 Хашковская А.
Науч. рук. доц. Пашкевич Л.Ф.

## ПОКЛОН ВАМ, БАТЬКА МИНАЙ!

Много мест в Придвинском крае связано с именем Миная Филипповича Шмырёва – славного сына белорусского народа. Якуб Колас в 1942 году написал о нем такие тёплые слова:

«Поклон тебе искренний, низкий, Наш Батька Минай!
Родным стал для нас ты и близким: Ты — это наш край».

Люди не забывают своих героев, их дела и подвиги. Они всегда в памяти народной . К таким славным сыновьям нашего отечества относится и Минай Филиппович Шмырёв.

Родился будущий партизанский командир 23 декабря 1891 года в бедной многодетной семье, в деревне Пунище Витебского района. Его отцу Филиппу Семёновичу удалось устроить Миная в Казаковскую церковно-приходскую школу, где 3 класса он закончил с хорошими оценками. В 1913 году его призвали в армию и зачислили в артиллерию. В боях на германском фронте Минай Филиппович часто проявлял храбрость при отбивании атак противника. За это был награждён тремя «Георгиевскими Крестами». В армии в Шмырёве растет протест против самодержавия и несправедливости.

Солдатам нравилась честность и справедливость Миная, кроме того он был добрым товарищем. Поэтому в феврале 1917 года солдаты избрали Шмырёва членом солдатского комитета артиллерийского дивизиона.

В октябре добровольно идёт в Красную Армию. В январе 1920 года его принимают в ряды Коммунистической партии. Минай Филиппович добровольно пошел служить в 155 полк внутренней службы по борьбе с бандитизмом . Для Шмырёва начались опасные и героичные дни борьбы с бандитами. Скоро он становится командиром взвода, за участие в ликвидации банды Жиглова в Витебске.

Бандиты как могли мстили Шмырёву: зверски убили отца и двух братьев отца, а 8 сентября 1921 года убили и брата Михаила. В мае 1922 года из местных жителей Шмырев организует первый в Витебской области партизанский отряд по борьбе с бандитизмом. В июне он был официально назначен командиром 14-го партизанского отряда и принимал участие в ликвидации банд до 1923 года. За проявленный при этом героизм М. Шмырёв был награждён орденом «Красного Знамени».